**В. П. Каламыцкі**

# ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ УРАДА БНР

Незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі была аб'яўлена 25 сакавіка 1918 г. Трэцяй Устаўной граматай, якая разрывала дзяржаўныя сувязі Беларусі з Расіяй і аспрэчвала пастановы Брэсцкага міру. Урад БНР разлічваў на падтрымку Германіі, якая раней прызнала незалежнасць Літвы. Ён хацеў выкарыстаць гэты вопыт, адправіўшы ў красавіку 1918 г. кайзеру Германіі Вільгельму II прывітальную тэлеграму і разлічваючы на палітычную падтрымку з яго боку. Але гэта ні да чаго не прывяло, бо адной з умоў Брэсцкага міру было непрызнанне Германіяй новых дзяржаў на землях былой Расійскай імперыі (А. А. Каваленя, 2018).

Нягледзячы на гэту геапалітычную няўдачу, кіраўніцтва БНР па-ранейшаму надавала вялікую ўвагу еўрапейскаму накірунку сваёй знешняй палітыкі. Вяліся перамовы з Літвой. Пры яе ўрадзе было створана Міністэрства беларускіх спраў, 6 беларусаў былі ўключаныя ў склад Рады Літвы, выдзяляліся грошы на культурна-асветніцкую дзейнасць, планавалася стварэнне беларуска-літоўскай дзяржавы з беларускай аўтаноміяй. Але тэрытарыяльныя прэтэнзіі Літвы да БНР, сталі галоўнай перашкодай для развіцця двухбаковага супрацоўніцтва. Урад Польшчы таксама меў тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Беларусі, імкнучыся аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. (Д. Міхалюк, 2015). Прадстаўнікі БНР прымалі ўдзел у нарадзе ў Ясах, Парыжскай, Вашынгтонскай і Генуэзскай мірных канферэнцыях. У Літве, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі, Балгарыі, Чэхаславакіі і Турцыі дзейнічалі дыпламатычныя місіі БНР. Але краіны Еўропы не прызналі яе незалежнасць афіцыйна, бо не лічылі беларускі нацыянальны рух дастаткова моцным (А. Н. Резник, 2002).

У знешнепалітычным плане Рада БНР камунікавала таксама з Украінай (працавалі беларускія консульствы у Кіеве і Адэсе, а ў Мінску – украінскае консульства) і Савецкай Расіяй. Спроба вырашыць тэрытарыяльную спрэчку з Украінай наконт Палесся поспеху не мела. У лістападзе 1918 г. адбыліся перамовы паміж прадстаўніком БНР Т. Грыбам і наркамам па справах нацыянальнасцей РСФСР І. Сталіным, якія таксама былі безвыніковымі.

Такім чынам, знешнепалітычную дзейнасць урада БНР характарызавалі пераважна еўрапейская арыентацыя, развіццё культурна-асветніцкай сферы, тэрытарыяльныя спрэчкі з суседзямі, некаторыя поспехі ў камунікацыі з асобнымі краінамі і адсутнасць рэальнай палітычнай падтрымкі. Яна не прывяла да стварэння незалежнай рэспублікі, але ўзняла дасведчанасць палітыкаў свету аб беларускім нацыянальным руху, што пазней адыграла станоўчую ролю ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Таму БНР можна лічыць зародкам беларускай дзяржаўнасці.